# Тваё ашчаджэнні ў PPK складаюцца з

**Працаўнік**
Ты 2%
+ дабраахвотна дадаткова да 2%

**Працадаўца**
ўплата 1,5%
+ дабраахвотна дадаткова да 2,5%

**Дзяржава**
250 зл
Стартавая ўплата
+240 зл на год

**Ашчадныя планы для працаўнікоў**
(PPK)
Гэта таго варта

**Ашчаджэнні ты можаш забраць у любы выгодны момант, без усялякіх падаткаў.**

Пасля 60 год 25% адразу, а 75% ад 120 выплат за перыяд ад 10 год
І раней, у выпадку:

- Сур'ёзнай хваробы тваёй, тваёго мужа ці жонкі або тваёго дзіцяці (да 25% сродкаў без абавязку вяртання);
- Пакрыцця тваёго ўласнага ўнёску, калі бярэш крэдыт на кватэру ці пабудову дома (для асоб, маладзейшых за 45 год, да 100% сродкаў з абавязкам вяртання).

PPK

**www.mojePPK.pl**




**Гэта таго варта**

www.mojePPK.pl

Pracownicze Plany Kapitałowe

# Што ты павінен ведаць?



## Ашчадныя планы для працаўнікоў (PPK) гэта:

- дабраахвотная
- прыватная
- выгадная

**праграма даўгатэрміновага ашчаджання на дадатковую пенсію, на якую складваешся ты, твой працадаўца і дзяржава.**

PFR Polski Fundusz Rozwoju
Ministerstwo Finansów
KANCELARIA PREZESA RADY MINISTRÓW

# Ашчадныя планы для працаўнікоў – найважнейшая інфармацыя

Ашчадныя планы для працаўнікоў (PPK) пры ўдзеле працадаўцы, **заснаваныя на найлепшых прыкладах з практыкі іншых краін**, дзе такія праграмы **паспяхова працуюць шмат гадоў.**

Сэнс у тым, каб забяспечыць табе і тваёй сям'і лепшую фінансавую бяспеку і лепшы стандарт жыцця пасля 60 год.

PPK – гэта праграма, у якой ты ашчаджаеш грошы з дапамогай працадаўцы і дзяржавы, сродкі збіраюцца на тваім прыватным рахунку. Грошы перадаюцца ў спадчыну і ты можаш забраць іх у любы момант.

Грашыма кіруюць фінансавыя ўстановы, абраныя паводле строгіх крытэрыяў бяспекі, і ты можаш за імі пастаянна назіраць.

**Ты нічога не павінен рабіць, каб адкладваць у PPK.** Кожная фірма, якае наймае ад аднаго працаўніка і абавязаная плаціць пенсійнае і рэнтнае страхаванне (то бок не толькі на працоўнай дамове, але і на падставе ўмовы даручэння), павінна стварыць PPK для сваіх працаўнікоў.

Сабранымі сродкамі кіруе фінансавая ўстанова, што бярэ ўдзел у праграме, якую **выбраў твой працадаўца ў згодзе з працаўнікамі**.
Увесь час удзелу у PPK ты адкладаеш у фонд на ўмовах інвестыцыйнай палітыкі, дапасаванай да твайго ўзросту.

## Праграма стартавала 1 ліпеня 2019 г.

Старт праграмы адбыўся 1 ліпеня 2019 г. У гэты час да яе далучыліся **фірмы, што наймалі ад 250 чалавек** па стане на 31 снежня 2018 г. Да 12 лістапада 2019 г. працадаўца падпісаў дамову аб увядзенні праграмы. Першыя ўнёскі у PPK паступаюць з першага заробку, выплачанага пасля заключэння гэтай дамовы.

## Чарговыя фірмы далучацца да праграмы:

### 1 ліпеня 2020 г.

- фірмы, якія наймаюць **ад 50 працаўнікоў** па стане на 30 чэрвеня 2019 г. Падпісанне дамовы аб увядзенні PPK да 11 мая 2020 г.

- фірмы, якія наймаюць **ад 20 працаўнікоў** па стане на 31 снежня 2019 г. Падпісанне дамовы аб увядзенні PPK да 10 лістапада 2020 г.

### 1 студзеня 2021 г.

- **іншыя прадпрыемствы** – падпісанне дамовы аб увядзенні PPK да 10 мая 2021 г., а таксама **установы з сектара дзяржаўных фінансаў** – падпісанне дамовы аб увядзенні PPK да 10 красавіка 2021 г.

Змест гэтага матэрыялу мае выключна інфармацыйны характар. Гэты змест не замяняе абавязковых заканадаўчых актаў і за кожным разам павінен разглядацца на падставе актуальных патрабаванняў заканадаўства. Гэты змест не з'яўляецца юрыдычнай фінансавай кансультацыяй ці афіцыйным тлумачэннем абавязковых патрабаванняў права.